**Пятушка, А.** На вайне як на вайне / А. Пятушка // Браслаўская звязда. — 2015. — 31 студз. — С. 2.

# НА ВАЙНЕ ЯК НА ВАЙНЕ

– Дзе жадаеш служыць?

– Там, куды Радзіма накіруе!

Менавіта так адказвалі савецкія юнакі на традыцыйнае пытанне афіцэраў у ваенкамаце падчас прызыву.

Так адказаў і сціплы хлопец з в. Солакаўшчына Яўген Падагель.

Жыццё толькі пачыналася. І два гады, здавалася, наўрад ці маглі сыграць вялікую ролю ў далейшым яго лёсе. Тым больш што да службы ў арміі ён сябе рыхтаваў даўно, нават у Віцебскім ДТСААФ здзейсніў тры скачкі з парашутам.

Юнак марыў трапіць у марфлот, бо надта форма там прыгожая. Але Яўгена накіравалі ў паветрана-дэсантныя войскі. Фізічна загартаванага хлопца зусім не пужала вайсковая муштра. Ды хто мог падумаць, што будучаму салдату больш спатрэбіцца маральная і псіхалагічная вытрымка.

Вайсковую навуку навабранец Я. Падагель спасцігаў у г. Фергане Узбекскай ССР. Праз тры месяцы «вучэбкі» яго прыняў у спякотныя абдымкі чужы і непрыветлівы Афганістан.

Не надта суцяшальнымі былі расказы ўжо абстраляных байцоў. Так, толькі перад самым прыбыццём чарговага папаўнення «духі» знішчылі самалёт ТУ-134, на якім дадому ляцелі 300 дэмабілізаваных служачых. Ды і іншыя жахлівыя гісторыі нацягвалі нервы да болю ў мышцах.

Я. Падагеля прызначылі ў эвакуацыйную роту вадзіцелем аўтамашыны ГАЗ-66 – аперацыйнай на калёсах, аснашчанай усім неабходным медыцынскім абсталяваннем, з брыгадай медыкаў.

На першы погляд можа здацца, што Яўгену пашансавала. Ён не хадзіў у разведку, не ўдзельнічаў у баях. Тым не менш жудасныя наступствы той вайны на ўсё жыццё цяжкім пякучым каменем ляглі на сэрца і душу Я. Падагеля, пра што сведчыць і ранняя сівізна на яго галаве.

– Спярша, – акунаецца ў балючыя ўспаміны Яўген Фідэлісавіч,– да параненых, асабліва тых, каму адарвала ногі ці рукі, страшна было датыкнуцца. Потым стала крыху лягчэй.

Але сумны погляд майго суразмоўцы сведчыць пра адваротнае. Ды і як можна прызвычаіцца да скалечаных юных цел. А колькі трэба маральных намаганняў, каб знайсці словы суцяшэння на просьбу бязногага маладога салдата даць яму аўтамат, каб застрэліцца. Давялося Яўгену Фідэлісавічу не раз бачыць, што ўкладвалі ў цынкавыя труны, і адпраўляць гэты жудасны груз у «чорных цюльпанах» да бацькоў.

На вайне як на вайне... Шмат аблічча ў гэтай крыважэрнай пачвары. Кожнаму яна вышчэрваецца па-рознаму. І трэба вытрымаць гэты звярыны аскал, а галоўнае, застацца чалавекам.

Падчас маіх сустрэч з былымі воінамі-афганцамі большасць з іх расказвалі і пра няпростыя ўзаемаадносіны паміж стараслужачымі і навабранцамі. Не абмінуў гэтую тэму і Яўген Падагель. Ён прыгадаў выпадак, як «дэмбель» вырашыў «правучыць» маладога байца, які стаяў на баявым пасту. «Вучоба» скончылася трагічнай смерцю паставога. Ды і сам Яўген пацярпеў ад «навукі» старэйшых саслужыўцаў.

Слухаю такія ашаламляльныя расказы і не магу ўцяміць, як можна здзекавацца са сваіх, з тых, з кім праз гадзіну трэба ісці плячо ў плячо ваяваць.

Уражвае, але ўжо ў добрым сэнсе, яшчэ адзін аспект: амаль усе «афганцы» не пісалі бацькам праўду. Утаіў ад родных сваё месца службы і Яўген.

– Адразу быццам і хацеў напісаць, – кажа Я. Падагель, – ды рука здрыганулася.

Паглядзеў салдат на палітычную карту свету і вырашыў, што для сям'і ён будзе служыць у чэхаславацкім гораддзе Браціслава. І толькі за тры месяцы да заканчэння службы бацькі выпадкова даведаліся праўду.

Адна аддушына была ў Афганістане – сабрацца ў палатках, узяць у рукі гітару і спяваць. Асвоіў гітарныя акорды і Яўген.

У СССР не ведалі тады сапраўднай сітуацыі, бо пра рэальныя афганскія падзеі не перадавалі ў навінах.

Гэтая вайна прарвалася да нас вершамі і песнямі, трагічнымі, светлымі і мужнымі. Не прафесіяналізмам яны каштоўныя, а перш за ўсё шчырасцю і пранізлівасцю. Яны, як салдаты, якія вярнуліся з бою, расказваюць нам пра мужнасць і сілу духу.

Нямала вады сплыло з таго часу. Але ўсё роўна пры першых струнных пераборах паўстаюць перад вачыма Яўгена Падагеля сумныя ўспаміны, а на сэрцы заные незагойная рана.

**Алена Пятушка**